# АСНОЎНЫЯ МЕХАНІЗМЫ ДЫНАМІКІ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ МАГНАТАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ

**Пацыенка С. А.**
*старшы выкладчык кафедры менеджмента сацыякультурнай дзейнасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Фарміраванне і развіццё духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння адбывалася ва ўмовах выразнай дыферэнцыраванасці вышэйшага саслоўя і кансалідацыі вузкай супольнасці магнатаў у яго межах. У сувязі з гэтым выбар кірункаў развіцця культуры магнацкай меншасці, якая характарызавалася элітарнасцю, здзяйсняўся вузкім колам арыстакратаў.

Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння ўяўляла сабой усе віды змен у культуры прадстаўнікоў элітарнай меншасці феадальнага саслоўя азначанага рэгіёну, якія характарызаваліся накіраванасцю, цэласнасцю, наяўнасцю выразных тэндэнцый. Дынаміка праяўлялася ва ўзаемадзеянні і ўзаемаўплывах духоўнай культуры магнатаў з іншымі культурамі і культурнымі канфігурацыямі, якія аказвалі на яе або самі падвяргаліся яе трансфармацыйным уздзеянням.

У аснове дынамікі любой культуры знаходзіцца патрэбнасць ў адаптацыі да зменлівых умоў. У сувязі з тым, што ні прырода, ні соцыум не могуць існаваць у нязменным стане, развіццё культуры ўяўляе сабой пастаянны пошук найбольш адэкватнага сітуацыі становішча яе элементаў.

Дынаміка духоўнай культуры характарызуецца разнастайнасцю тэмпаў і рытмаў. У розныя гістарычныя перыяды працэсы змяненняў актывізуюцца альбо запавольвольваюцца. Глыбіня змяненняў, ступень іх уплываў, накіраванасць залежаць ад механізма культурнай дынамікі.

Механізм дынамікі культуры канкрэтнай супольнасці ў агульным выглядзе можна прадставіць наступным чынам. Пад уплывам знешняга ўздзеяння на культуру альбо яе ўнутранай трансфармацыі ўзнікае пагроза ўстойлівасці культуры. У выніку парушэння ўстойлівасці знікае баланс паміж яе элементамі, з’яўляецца верагоднасць страты структурнай упарадкаванасці і ўзгодненасці ў працэсе функцыянавання розных падсістэм, спынення інтэгрыруючых узаемадзеянняў, разбурэння існуючых механізмаў рэгуляцыі і г.д. Ва ўмовах нераўнавагі ўзнікае патрэбнасць у стабілізацыі становішча культуры. Пераадоленне стану нераўнавагі прыводзіць да якаснага змянення культуры і дасягнення раўнавагі на новым узроўні.

Прадстаўнік амерыканскай антрапалагічнай школы Р. Карнейра вызначыў два фундаментальныя тыпы змяненняў любых сістэм: узнаўленне стану і трансфармацыя стану [1, с. 436]. У першым выпадку змяненне ўзнаўляе парушаны папярэдні стан раўнавагі, у другім – змяненне выклікае прынцыпова новы, адрозны ад папярэдняга, стан. На наш погляд, у культуры, як складанай дынамічнай сістэме, магчымы толькі другі тып змянення. Гэта звязана з аб’ектыўнай немагчымасцю яе звароту да стану раўнавагі на папярэднім узроўні, што абумоўлена такімі фактарамі, як складанасць элементаў, іх вялікая колькасць, разнастайнасць узаемасувязей паміж імі і інш.

У якасці прыклада разгледзім змяненні ў культуры магнатаў, якія былі выкліканы Рэфармацыяй і Контррэфармацыяй. Рэфармацыя з’явілася спецыфічным спосабам «прыстасавання сацыярэлігійнай структуры да зведаўшых змены матэрыяльных умоў жыцця» [1, с. 430]. У сярэдзіне XVI ст. прагрэсіўна настроеныя магнацкія колы Беларускага Панямоння, адчуваючы патрэбу ў адаптацыі старых рэлігійных і сацыяльных інстытутаў да новых эканамічных умоў, актыўна ўключыліся ў працэс рэфармавання. У пратэстантызм перайшлі прадстаўнікі родаў Агінскіх, Пацаў, Сапегаў, Радзівілаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вяртанне згубленых пазіцый каталіцкай царквы ў выніку Контррэфармацыі ў другой палове XVI ст. здзяйснялася на якасна новым узроўні, які ўжо адпавядаў актуальным патрабаванням жыцця. У выніку адбыўся зварот элітарнай групы да каталіцтва, які з'явіўся альтэрнатыўным кірункам далейшага развіцця. Страта пазіцый стала для каталіцкай царквы спецыфічным імпульсам да развіцця і актывізавала яе патэнцыял, які праявіўся, напрыклад, у актыўнай культуратворчай дзейнасці ордэна іезуітаў. Такім чынам, узнаўленне стану раўнавагі культуры, якое праявілася ў вяртанні магнатаў у каталіцызм, адбылося на якасна новым узроўні і ўяўляла сабой уключэнне ў прынцыпова новую рэлігійную, сацыяльную і культурную сістэму.

Пошук устойлівасці культуры пасля парушэння раўнавагі можа рэалізавацца ў двух альтэрнатыўных кірунках: на аснове здабыткаў культурнай спадчыны шляхам звароту да назапашанага вопыту, адбора яго найбольш адпаведных канкрэтным умовам форм і іх інтэрпрэтацыі; у выпадку ўзнікнення навацый або запазычання культурных узораў у іншых сацыякультурных сістэмах шляхам адаптацыі новых культурных форм да патрэбаў асяроддзя.

Такім чынам, у першым выпадку выхад са стану нераўнавагі здзяйсняецца ў працэсе звароту да папярэдняга культурнага вопыта. У сучаснай культуралогіі культурная спадчына разглядаецца як сукупнасць дасягненняў духоўнай культуры грамадства, увесь яго гістарычны вопыт, які ўключае як актуальныя кампаненты, так і такія, што пакуль не прыжыліся, але існуе магчымасць звароту да іх пазней. Большая частка культурных праграм з часам губляе сваю актуальнасць і, паступова забываючыся, знікае з ужытку носьбітаў культуры альбо відазмяняецца ў працэсе ўсталяваня новай сістэмы каштоўнасцей. Меншая частка такіх праграм, «наадварот, папаўняючыся, не знікае з радавой памяці чалавецтва, а пераходзіць з пакалення ў пакаленне, з эпохі ў эпоху, з аднаго гістарычнага тыпа грамадства ў іншы, захоўваючы ў цэласнасці сваё інфарматыўнае ядро» [2, с. 11].

Выкарыстанне назапашанага папярэднімі пакаленнямі масіва ўзораў, каштоўнасцей, сімвалаў, сэнсаў культуры магчыма пры іх адаптацыі да актуальных умоў. Змены ў палітыцы, эканоміцы, навуцы і іншых сферах сацыяльнага жыцця непазбежна выклікаюць неабходнасць мадэрнізацыі культурнага вопыту продкаў з мэтай прывядзення яго ў адпаведнасць з новай сітуацыяй.

Альтэрнатыўным выхадам культуры са стану нераўнавагі з'яўляюцца навацыі. Навацыя (ад лат. Novatio – абнаўленне, змяненне) актуалізуе такую якасць культуры як здольнасць да трансфармавання, яе гнуткасць і ўспрымальнасць да зменлівых ўмоў. Эфектыўная інавацыйная дзейнасць прыводзіць да ўзнікнення якасна новых культурных форм. Пазітыўны ўплыў пранікнення новых ідэй зключаецца ў тым, што, як адзначыў Ф. Боас, яны становяцца значным стымулам для далейшага развіцця культуры [1, с. 344].

Актывізацыі ўзнікнення навацый спрыяе шэраг разнастайных фактараў. Так, у гістарычных умовах Вялікага Княства Літоўскага ўзнікненне навацый было абумоўлена наяўнасцю ў грамадстве такой сацыякультурнай групы як магнаты, культурны і эканамічны ўзровень якой дазваляў ёй адэкватна ўспрымаць і станавіцца носьбітам новаўвядзенняў, актыўна і гарманічна выкарыстоўваць іх у сваёй дзейнасці, зрабіць часткай паўсядзённага жыцця. Пранікненню экзагенных навацый спрыяла высокая ступень інтэнсіўнасці кантактаў паміж прадстаўнікамі магнатэрыі Беларускага Панямоння з краінамі Заходняй Еўропы, што было абумоўлена, у першую чаргу, геаграфічным і геапалітычным становішчам рэгіёну. Акрамя таго, агульнасць сацыякультурнай прасторы з Каралеўствам Польскім (асабліва пасля 1569 г.) актуалізавала аўтаматызм прымянення навацый, які нярэдка забяспечваўся такім універсальным механізмам рэтрансліравання як мода.

Узнікненне і прыняцце навацый актывізуецца ў перыяды знаходжання культуры ў стане нераўнавагі, калі павялічваецца адчувальнасць культурнага асяроддзя да зменаў. Рухомасць і адкрытасць структуры спрыяе найбольш лёгкаму пранікненню і

замацаванню навацый у светапоглядзе значнай часткі соцыўма, а таксама ў адносна хуткай іх адаптацыі. Прымаючы да ўвагі нестабільнасць палітычнага, рэлігійнага жыцця Беларускага Панямоння ў XVI–XVIII стст., можна растлумачыць высокую частату пранікнення навацый у культуру рэгіёну ў гэты перыяд.

Такім чынам, асноўнымі механізмамі дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння з'яўляліся традыцыі і навацыі. Значнасць традыцыі як акумулятара базавых каштоўнасцей духоўнай культуры заключалася ў захаванні і інтэграцыі здабыткаў культурнай спадчыны папярэдніх пакаленняў магнатаў у актуальную сацыякультурную практыку, забеспячэнні пераемнасці культурных норм, звычаяў, узораў і інш. Успрыманне мінулага як асобага роду каштоўнасці актуалізавала важнасць захавання духоўнай спадчыны магнацкіх сем'яў. Зварот да традыцыі спрыяў актывізацыі стабілізацыйных працэсаў у культуры.

Узнікненне або запазычанне новых культурных узораў выклікала інварыянтнасць духоўнай культуры магнатаў, разнастайнасць яе праяўленняў. Інтэграцыя навацыйных кампанентаў у духоўную культуру магнатаў Беларускага Панямоння праявілася ў адаптацыі форм еўрапейскай культурнай практыкі да мясцовых умоў. Гэта забяспечвалася актыўнымі кантактамі магнатаў з прадстаўнікамі еўрапейскай арыстакратычнай і творчай эліты, рознымі відамі міжкультурных узаемадзеянняў (атрыманне адукацыі ў еўрапейскіх культурна-адукацыйных цэнтрах, канфесійнае ўзаемадзеянне, паступовае далучэнне да лацінскай і польскай моўных традыцый і інш.). У цэлым інтэнсіўнасць міжкультурных стасункаў, аўтаматызм прымянення навацый, іх спалучэнне з традыцыямі садзейнічала дынамічнаму развіццю духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Літаратура***

1. Антология исследований культуры: Т. 1. Интерпретация культуры / ред. С. Я. Левит. – СПб.: Университетская книга, 1997. – 548 с.

2. Ширшов, И. Е. Динамика культуры / И. Е. Ширшов. – Минск: Изд-во БГУ, 1998. – 112 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ